Год выдання VI
№ 6 (121)
17 красавіка 1941 года
Цана 10 к.

Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# За Ленінскія кадры

ОРГАН партбюро, камітэта ЛКСМБ, прафкома, МК і рэктарыята Беларускага дзяржаўнага універсітэта

## ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ ПРАВЯДЗЕМ ВЫБАРЫ ПАРТОРГАНАЎ

Па рашэнню ЦК ВКП(б) у красавіку—маі месяцы будуць праведзены чарговыя выбары нізавых партыйных органаў. Справаздачна-выбарчы сход партарганізацыі ўніверсітэта, згодна плана Кагановіцкага РК КП(б)Б, адбудзецца 6 мая. Да гэтага часу пройдуць справаздачна-выбарчыя сходы партгруп на факультэтах.

Выбары нізавых партыйных органаў ў гэтым годзе будуць праходзіць у абстаноўцы вялікага палітычнага і гаспадарчага ўздыму, выкліканага рашэннямі XVIII Усесаюзнай канферэнцыі ВКП(б).

Партыйная арганізацыя нашага універсітэта за прайшоўшы год дабілася значных поспехаў як у сваёй рабоце, так і ў рабоце ўніверсітэта. За лік лепшых людзей БДУ яна вырасла на 21 член і 12 кандыдатаў партыі. Значныя поспехі дасягнуты ў справе павышэння якасці вучобы.

Але побач з гэтым у рабоце партыйнай арганізацыі ёсць істотныя недахопы. Слаба працуюць партыйныя групы некаторых факультэтаў (фізмат), а асобныя з іх амаль самаліквідаваліся (біяфак). Партыйнаму бюро патрэбна многа папрацаваць над тым, каб узмацніць палітыка-выхаваўчую работу сярод студэнтаў, вышэй узняць якасць вучобы і навукова-даследчай работы ва універсітэце. Комуністы павінны быць перадавікамі ў вучобе.

У гэтым годзе мы будзем адзначаць дваццацігоддзе Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Перад партыйнай арганізацыяй стаіць задача — прыйсці да юбілея з высокімі паказчыкамі ва ўсіх галінах нашай работы—навуковай, вучэбнай і выхаваўчай.

Справаздачна-выбарчыя сходы на факультэтах і універсітэцкі партыйны сход, адзначаючы значныя поспехі ў рабоце, павінны з большэвіцкай непрымірымасцю ўскрыць усе недахопы з тым, каб знішчыць іх у працэсе далейшай работы.

## Больш увагі партгрупе

Партгрупа гістфака — адна з большых груп у партарганізацыі універсітэта. Зараз у ёй налічваецца 12 членаў і 8 кандыдатаў партыі. Комуністы факультэта займаюць вядучую ролю ў вучобе. Кандыдат у члены ВКП(б) тав. Абецэдарскі — сталінскі стыпендыят. Займаючыся увесь час на выдатна, ён вядзе вялікую навукова-даследчую і грамадскую работу. Комуністы Міхееў, Шакаль, Калінін і Кухаронак таксама з'яўляюцца выдатнікамі вучобы.

Акадэмічная работа, барацьба за няўхільнае выкананне пастаноў партыі і ўрада аб умацаванні працоўнай дысцыпліны, кіраўніцтва комсамольскай арганізацыяй, масава-выхаваўчая работа сярод студэнтаў—вось тыя асноўныя пытанні, якімі займалася партыйная група.

Але ў рабоце групы ёсць рад істотных недахопаў. Аб іх гаварылі 16 красавіка на справаздачна-выбарчым сходзе тт. Дудкоў, Чымбург, Рыбакоў, Чарняўскі, Хайдовіч і др. Партыйная група мала займалася пытаннем палепшання вучобы студэнтаў. У часе зімовай сесіі 34 студэнты, з іх 32 комсамольцы, атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Соцыялістычнае спаборніцтва носіць яшчэ фармальны характар. Дагаворы правяраюцца ад сесіі да сесіі. Слаба адчуваецца на факультэце работа комсамольскай арганізацыі.

З боку партбюро не было дастатковага кіраўніцтва і дапамогі. Партыйная група была прадстаўлена сама сабе.

Работа партгрупы прызнана здавальняючай. Парторгам сход выбраў тав. Кацмана.

## НОВЫЯ СТАЛІНСКІЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

**Канстанцін Цішкевіч (II курс гістфака), Васілій Чубакоў (II курс хімфака) і Міхаіл Савіцкі (IV курс біяфака) — лепшыя з лепшых выдатнікі вучобы. Універсітэцкая грамадскасць ведае іх, як сур'ёзных студэнтаў, крапатліва і ўпорна працуючых над авалодваннем багаццямі навукі. Выдатную вучобу яны ўмела спалучаюць з вялікай работай у навукова-даследчых гуртках і ўдзелам у грамадскай рабоце.**

**Урад БССР па прадстаўленню вучонага совета Універсітэта ўдастоіў тт. Цішкевіча, Чубакова і Савіцкага вялікай чэсці, назначыўшы ім стыпендыі імені таварыша Сталіна. Няма сумнення ў тым, што яны з гонарам апраўдаюць званне сталінскіх стыпендыятаў.**

* * *

## АПРАЎДАЮ ВЫСОКАЕ ЗВАННЕ

Няма слоў, каб выразіць радасць у сувязі з назначэннем мне стыпендыі імені таварыша Сталіна. Гэты факт яшчэ раз паказвае тыя вялікія клопаты і ўвагу, якія праяўляюць аб нас, совецкіх студэнтах, партыя большэвікоў і совецкі ўрад.

На працягу трох год вучобы на хімічным факультэце я маю толькі выдатныя адзнакі. Дабіўся я іх ў выніку ўпорнай і сістэматычнай работы над сабой.

Набліжаецца вясенняя экзаменацыйная сесія. Яна супадае з вялікай падзеяй у жыцці нашага універсітэта—дваццацігадовым юбілеем яго існавання. Рыхтуючыся да сесіі і юбілея, я прыкладу ўсе намаганні на тое, каб здаць экзамены толькі на выдатна і гэтым апраўдаць пачэснае званне сталінскага стыпендыята.

**Сталінскі стыпендыят В. ЧУБАКОЎ, студэнт II курса хімфака.**



**На здымку:** праф. **Ломцеў** чытае лекцыю студэнтам I курса філфака па моваэнаўству.

## ПЕРАД НОВЫМ НАБОРАМ

У рэктарыят універсітэта паступаюць пісьмы ад выпускнікоў сярэдніх школ. Пішуць з Украіны, з асобных абласцей РСФСР, з беларускіх сярэдніх школ і інш. Вучаніца 10 класа 55 сярэдняй школы гор. Новасібірска Зоя Меркіна просіць выслаць умовы прыёма ва ўніверсітэт. Таня Арцянюк (Сухумская сярэдняя школа № 6 імені А. С. Пушкіна), жадаючая паступіць на хімічны факультэт, пытаецца, ці ёсць на ім рускае аддзяленне, «а калі няма, то ці можна паступіць на беларускае, слаба валодаючы беларускай мовай». Яе цікавіць, якія прадметы прыдзецца здаваць на прыёмных іспытах, ці ёсць інтэрнат, якія перавагі пры паступленні выдатнікам і др.

Вучаніца гор. Роўны, Сумскай вобласці УССР т. Гаруновіч, В. Усава і О. Сіманава (Усць-Катаеў, Чэлябінскай вобласці), Галецкая і Абвяшкоўская з гор. Оршы просяць выслаць праграмы прыёмных іспытаў, даць апісанне факультэтаў і іх профіль.

Рэктарыят ўніверсітэта праводзіць зараз падрыхтоўчую работу да новага набора. На фізіка-матэматычным факультэце арганізавана алімпіяда юных матэматыкаў, у якой прымаюць удзел выпускнікі школ гор. Мінска. Будучым студэнтам выкладчыкі факультэта прачытаюць рад навукова-папулярных лекцый па фізіцы і матэматыцы.

У красавіку для вучняў 10 класаў рэспублікі праз радыёстанцыю імені Соўнаркома БССР будзе наладжан радыё-вечар. Даклад аб ролі ўніверсітэта ў развіцці навукі БССР зробіць рэктар тав. Савіцкі, акад. В. Н. Перцаў выступіць з тэмай «Як выбраць сабе спецыяльнасць». «Буду дастойным спецыялістам сталінскай эпохі»—такой тэме прысвечыць сваё выступленне студэнт IV курса гістфака сталінскі стыпендыят Абецэдарскі.

Навуковыя работнікі універсітэта наведаюць школы сталіцы і многіх гарадоў рэспублікі, раскажуць выпускнікам аб дзецішчы вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі—Беларускім дзяржаўным універсітэце. Рэдакцыя шматтыражкі выпускае спецыяльны нумар, прысвечаны новаму набору.

## „Я НЕ ГІСТОРЫК"

### ЯК НЕКАТОРЫЯ ВЫКЛАДЧЫКІ АВАЛОДВАЮЦЬ БОЛЬШЭВІЗМАМ

8 красавіка адбылася тэарэтычная канферэнцыя навуковых работнікаў гістарычнага і філалагічнага факультэтаў па рабоце В. І. Леніна «Дзяржава і рэволюцыя».

На канферэнцыі былі заслуханы і абмеркаваны даклады дац. Шэўчэнка «Марксісцка-ленінскае вучэнне аб паходжанні, класавай сутнасці і формах дзяржавы», дац. Шашкова «Марксісцка-ленінскае вучэнне аб дыктатуры пролетарыята», ст. выкладчыка Старжынскага «Развіццё Леніным і Сталіным марксісцкага вучэння аб соцыялістычнай дзяржаве» і ст. выкладчыка тав. Партона «Соцыялізм і комунізм».

Канферэнцыя прайшла па нізкім тэарэтычным узроўні. Усе дакладчыкі, за выключэннем тав. Старжынскага, слаба падрыхтаваліся да дакладаў. Даклады тт. Шэўчэнка і Шашкова прадстаўлялі сабой просты мантаж цытат, самастойнасці ў дакладах зусім не было. Тав. Шэўчэнка не змог растлумачыць сапраўдных прычын узнікнення дзяржавы і марксісцка-ленінскага паняцця ролі насілля. Не быў дадзен аналіз рабаўладальніцкай, феадальнай і буржуазнай дзяржаў. Адсутнасцю самастойнасці і глыбокага ізлажэння марксісцка-ленінскага вучэння аб дыктатуры пролетарыята грашыў і даклад тав. Шашкова. Тав. Шашкоў не змог паказаць творчага характара марксісцка-ленінскага вучэння аб дзяржаве. Дакладчык не ведаў поглядаў Каўцкага і Плеханава па пытанню злома буржуазнай дзяржаўнай машыны. Гэта сведчыла аб тым, што тав. Шашкоў нават не прачытаў усёй работы Леніна «Дзяржава і рэволюцыя». Таксама ён не змог растлумачыць погляду анархістаў і ў прыватнасці здрадніка Бухарына аб адносінах пролетарыята да буржуазнай дзяржавы ў перыяд рэволюцыі, не ведаў паўанархічных поглядаў Бухарына аб «узрыве» дзяржавы.

Тав. Партон недастаткова прадумаў палажэнне Маркса і Леніна аб так званым «буржуазным праве» пры соцыялізме.

Сур'ёзна к падрыхтоўцы даклада падышоў тав. Старжынскі. Яго даклад быў прадуманым. Былі акрэслены асноўныя палажэнні Леніна і Сталіна аб соцыялістычнай дзяржаве.

У абмеркаванні дакладаў прынялі ўдзел тт. Пьянкоў, Зальцман і Кацман. Вынікі канферэнцыі падвёў тав. Чымбург.

Канферэнцыя паказала, што многія навуковыя работнікі яшчэ недастаткова і не сістэматычна працуюць як над вывучэннем «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», так і над творамі класікаў марксізма-ленінізма. Чаго варта хоць-бы такая заява тав. Шашкова перад пачаткам свайго даклада: «Я, таварышы, не гісторык, і пагэтаму мне цяжэй рабіць даклад, чым вам, гэта значыць гісторыкам». Гэта лішні раз пацвярджае тую акалічнасць, што яшчэ частка навуковых работнікаў «вывучае» творы марксізма-ленінізма толькі ў сувязі з той або іншай тэмай лекцыі па сваёй спецыяльнасці, калі патрэбуецца прывесці цытату з першакрыніц класікаў.

Пара пакончыць з цытатным вывучэннем марксісцка-ленінскай тэорыі. Такое вывучэнне ў аснове шкодна большэвізму. Неабходна сістэматычна і глыбока вывучаць марксісцка-ленінскую тэорыю — вастрэйшую зброю большэвізма.

Трэба ліквідаваць самацёк у справе самастойнага вывучэння навуковымі работнікамі марксізма-ленінізма. Правядзенне тэарэтычных канферэнцый або субяседванняў не рашаюць пытання аб самастойнай рабоце навуковых работнікаў над вывучэннем гісторыі і тэорыі большэвізма. Яны з'яўляюцца толькі падвядзеннем вынікаў самастойнай работы над творамі класікаў. У нас-жа, па сутнасці справы, тэарэтычныя субяседванні ператвораны ў сістэму, у асноўны метад вывучэння марксізма-ленінізма. У выніку атрымоўваецца, што ад канферэнцыі да канферэнцыі (а іх бывае ў годзе па адной) многія навуковыя работнікі не вывучаюць марксізма-ленінізма. Такое палажэнне ні ў якім разе нельга лічыць нармальным.

К.

